# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 656.835.112:[351.852.12:069](476)

*А. Я. Паўлава*

## Паштоўкі ў асабістых зборах дзеячаў культуры Беларусі

*Аўтарам прадстаўлены вынікі вывучэння адкрытых лістоў (паштовак) з асабістых фондаў пісьменніка Уладзіміра Караткевіча, літаратуразнаўца Адама Мальдзіса, мастака Яўгена Куліка і гісторыка-краязнаўца Віталія Скалабана, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Даследуюцца відавы склад паштовак, дызайн і тэматыка сюжэтаў на вонкавым баку паштовак. Звяртаецца ўвага на асаблівасці тэксту і тэматыкі паведамленняў і віншаванняў у перапісцы. Беларускія і замежныя паштоўкі аналізуюцца з крыніцазнаўчага боку. Робіцца выснова аб перспектывах выкарыстання іх у якасці крыніц па гісторыі масавай пісьмовай камунікацыі і святочнай культуры.*

***Ключавыя словы:*** *асабістыя фонды, крыніцы, перапіска, адкрытыя лісты, ілюстраваныя паштоўкі, масавая камунікацыя, віншаванні, паведамленні.*

*A. Paulava*

## Postcards in personal collections of Belarusian cultural figures

*The author presents the results of the study of open letters (postcards) from the personal collections of the writer Vladimir Korotkevich, literary scholar Adam Maldis, artist Evgeny Kulik and local historian Vitaly Skolaban, stored in the Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art. The article studies the species composition of postcards, the design and themes of the plots on the outside of the postcards, pays attention to the features of the text and themes of messages and greetings in the correspondence. The author analyzes Belarusian and foreign postcards from the source study point of view and concludes on the prospects of their use as sources on the history of mass written communication and festive culture.*

***Keywords:*** *personal collections, sources, correspondence, open letters, illustrated postcards, mass communication, greetings, messages.*

Паштоўка, узнікшы ў другой палове XIX ст. у працэсе змен эпісталярнай практыкі як новая форма міжасабовай камунікацыі, на працягу больш за 100 гадоў застаецца распаўсюджаным спосабам паштовых адпраўленняў. Прычынай такога пасняховага доўгажыхарства паштоўкі можна назваць патрэбу людзей у зносінах і захаванні на па-

мяць вобразаў аб'екта або падзеі (праз яго выяву або пісьмовае паведамленне) эканамічна зручным спосабам (адкрыты ліст – гэта разнавіднасць паштовай карэспандэнцыі). Зносіны з дапамогай адкрытага ліста як формы для кароткай ветлівай перапіскі, знака сяброўскай увагі і клопату ператварыліся ў традыцыю.

Поліфункцыянальнасць, політэматычнасць і здольнасць паштоўкі да пераходу з аднаго камунікатыўнага асяроддзя ў іншае дазваляе меркаваць, што для творчых асоб яна была важным крокам у міжасабовых зносінах. Як паказаў агляд асабістых фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, сярод фондаўтваральнікаў дзеячаў культуры і краязнаўцаў калекцыянераў паштовак няма, яны ў большасці аддавалі перавагу традыцыйнаму ліставанню.

*Мэта даследавання* – вывучэнне інфармацыйнага патэнцыялу перапіскі на паштоўках як крыніцы ў даследаваннях гісторыі масавай камунікацыі, святочнай культуры і спосабу папулярызацыі культурнай спадчыны.

Прапануем разгледзець паштоўкі са збораў У. С. Караткевіча, А. І. Мальдзіса, Я. С. Куліка і В. У. Скалабана. У якасці сведчання прыватнай перапіскі, прафесійнай дзейнасці і ўдзелу фондаўтваральнікаў у віншавальным рытуале былі захаваны класічныя аднабаковыя паштовыя карткі і ілюстраваныя паштоўкі.

Ілюстраваныя паштоўкі – з'ява, якая склалася ў межах гарадской культуры. Адна з яе разнавіднасцей – паштоўкі з краявідамі. Урбаністычны пейзаж як фотажанр панарамна або асобнымі малюнкамі ў цікавых ракурсах адлюстроўвае жыццё горада, гістарычнага цэнтра, культавыя збудаванні, лячэбныя і навучальныя ўстановы, вакзалы, помнікі, рэкі і інш. [18]. Творчая і даследчая дзейнасць садзейнічала фарміраванню дзеячамі культуры збораў паштовак з выявамі архітэктурных аб'ектаў. У фондах У. С. Караткевіча захаваўся набор паштовак мастака І. В. Мядзведзева «Помнікі архітэктуры БССР» (1957) з лірычна-іранічнымі каментарыямі літаратара да сябра Юрыя Гальперына. Так, на першай паштоўцы з выявай Камянецкай вежы У. Караткевіч адзначыў: «Сім пачынаю дасылаць серыю архітэктурных старажытнасцей нашай з табою Айчыны, да будзе ёй мір і шчасце на стагоддзі. І хай будуць жыхары яе разумныя» (мал. 1) [2,



Мал. 1. Паштоўка з набору «Помнікі архітэктуры БССР».
Мастак І. В. Мядзведзеў. 1957 г.

арк. 1б]. Пісьменнік адзначыў, што вартымі для наведвання з'яўляюцца Ружанскі палац Сапегаў, Слуцкая брама ў Нясвіжы, Віцебская ратуша, Мікалаеўская царква ў Магілёве. Пра беларускія аб'екты, што ўвайшлі ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, – Мірскі замак і Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс – ён сказаў: «...якое хараство, нягледзячы на адсутнасць яскравай архітэктуры» [Там жа].

Вялікая колькасць паштовак знаходзіцца ў фондзе мастака ў жанры кніжнай і станковай графікі Я. Куліка. У працэсе прафесійнай дзейнасці Яўген Сяргеевіч Кулік сабраў годную калекцыю розных паводле функцыяналу і сюжэтаў фотапаштовак: 307 краявідных, у ліку якіх падзейныя і віншавальныя вытворчасці краін Еўропы, Азіі і Афрыкі; 657 рэпрадукцыйных – з творамі выбітных еўрапейскіх і расійскіх мастакоў; 112– выдавецтваў «Беларусь» і «Полымя» і фотакопіі беларускіх краявідных паштовак рубяжа XIX–XX стст. (мал. 2, 3) [12, с. 14–15, 76–82, 177–187).




Мал. 2. Паштоўка «Минск. Площадь Ленина. С праздником!».
Мастак У. Філімонаў. Выдавецтва «Беларусь». 1966 г.




Мал. 3. Паштоўка «Мінск. Манумент Перамогі. Палац спорту».
Мастак Ю. Рахоўскі. Выдавецтва Міністэрства сувязі. 1980 г.

Вывучэнне паштовак гэтага збору дазволіла выявіць 28 відавых фотапаштовак пачатку XX ст. з выявамі беларускіх гарадоў (Мінск, Брэст, Гродна, Полацк, Магілёў (мал. 4), Віцебск, Орша (мал. 5), Слонім і г. д.). Дзве з іх уяўляюць сабою адкрытыя лісты на адваротным баку, датаваныя 1908–1909 гг., – перапіску паміж сёстрамі школьнага ўзросту і жанчынамі-прыяцелькамі. Арыентаваная на гасцей сталіцы Беларусі паштоўка серыі «Турыст» ад А. Мальдзіса з выявай плошчы Леніна і апісаннем гэтага аб'екта захоўваецца ў фондзе паэта П. Масальскага [10, арк. 16; 15, арк. 1–18].



Мал. 4. Паштоўка «г. Магілёў. Губернскі вакзал». Выдавецтва А. С. Суворына і К. 1912 г.



Мал. 5. Паштоўка «Станцыя Орша». Выдавецтва А. С. Суворына і К. 1912 г.

У перапісцы калег з Адамам Іосіфавічам Мальдзісам паштоўкі часта замянялі звычайнае ліставанне, аб чым сведчаць як выявы, так і тэксты. Адрасанты выкарыстоўвалі для перапіскі не толькі віншавальныя, але і краявідныя, мастацкія паштоўкі, што значна павялічвае інфармацыйную вартасць такіх збораў. Так, супрацоўніца Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Т. Р. Маліноўская інфармавала А. І. Мальдзіса аб знаходжанні ў музеі цікавых мемуарных крыніц дру-

гой паловы XIX ст. праз паведамленне на фотапаштоўцы 1980 г. з выявай Мірскага замка да рэканструкцыі (мал. 6). Т. Маліноўская адрасавала А. Мальдзісу інфармацыю пра стварэнне ў 3 пакоях былога дома Багдановічаў у Гродна філіяла бібліятэкі і мемарыяльнай экспазіцыі пра паэта на фотапаштоўцы «Буслы» [9, арк. 9, 14].



Мал. 6. Паштоўка «Мірскі замак».
Фатограф А. А. Захарчанка. Выдавецтва «Планета». 1980 г.

У фондзе краязнаўца В. Скалабана захаваліся дзве паштоўкі з выявамі папулярных канцэртных пляцовак, выпушчаныя беларускім аддзяленнем Міжнароднай рады ЮНЕСКА па помніках і мясцінах, выдадзеныя да Міжнароднага дня помнікаў і мясцін 18 красавіка. У паштоўцы з выявай Палаца прафсаюзаў у г. Мінску за 2004 г. Міжнародны савет па ахове помнікаў і славутых мясцін (Беларускі камітэт ICOMOS) звяртаецца да спецыялістаў: «Давайце і мы ў гэты дзень атулім клопатам нашыя помнікі і мясціны. Супольнымі намаганнямі захаваем лепшыя набыткі мінулага для будучых пакаленняў». На паштоўцы за 2005 г. размешчана выява Белдзяржфілармоніі, кароткае апісанне будынка і зварот Беларускага камітэта ICOMOS: «Давайце выкарыстаем гэты дзень, каб прывабіць увагу нашага грамадства да вартасцей старадаўніх будынкаў, гістарычных гарадоў і краявідаў, якія складаюць культурную памяць» [11, арк. 1–19, 21–22].

Зручны фармат, вялікі тыраж і магчымасць масавага распаўсюджання зрабілі паштоўку незаменным адукацыйным сродкам. Распаўсюджаным выяўленчым сюжэтам для паштовак сталі малюнкі па матывах літаратурных твораў і партрэты дзеячаў літаратуры. У зборы Я. Куліка звяртаюць на сябе ўвагу наборы, прысвечаныя беларускім літаратарам. Гэта паштоўкі «Дзяржаўнага выдавецтва БССР» з рэпрадукцыямі гравюр А. Кашкурэвіча да твораў Я. Купалы «Бандароўна» і «Курган» (1962), паштоўкі з партрэтамі М. Багдановіча, Я. Коласа, Я. Купалы, П. Броўкі, І. Мележа, М. Лынькова і інш.) [14, арк. 1–6]. Я. Кулік захаваў набор фо-

тапаштовак рэпрадукцый карцін П. Сергіевіча, П. Явіча. У зборы паэта П. Масальскага захаваўся ліст ад А. Мальдзіса, напісаны на рэпрадукцыйнай паштоўцы з палатном М. Савіцкага «Куст ружаў» [10, арк. 4].



Мал. 7. Янка Купала. Адкрыты ліст «першага дня». Мастак М. Шаўцоў. Міністэрства сувязі СССР. 1982 г.

Я. Кулік захаваў паштовыя карткі з выявамі Я. Купалы і Я. Коласа, выдадзеныя да 100-гадовых юбілеяў паэтаў (мал. 7), да 100-гадовага юбілею М. Багдановіча з паштовым штэмпелем і тэматычнай маркай «Народныя святы. Іван Купала ў Беларусі» [13, арк. 11, 16]. У фондзе В. Скалабана знаходзіцца паштоўка Дзяржаўнага літаратурнага музея М. Багдановіча з партрэтам паэта і вершам «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…» [11, арк. 20].

Значнай падзеяй у Беларусі стала святкаванне 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны. Мастакі краіны спецыяльна стварылі некалькі паштовак з гэтай нагоды. У фондзе Я. Куліка зберагаецца падборка паштовак выдавецтва «Беларусь», у тым ліку з малюнкамі мастака М. Селяшчука (мал. 8) і гравюрамі А. Салькова [14, арк. 1–8].



Мал. 8. Паштоўка «Францыск Скарына». Мастак М. Селяшчук. Афармленне Г. І. Мацур. Выдавецтва «Беларусь». 1990 г.

Поспех камунікацыі вызначаўся ў значнай меры візуальным складальнікам паштоўкі: дзякуючы патэнцыялу ілюстрацыі паштоўка спрыяла масаваму развіццю міжасобаснай перапіскі. Віншаванне з дапамогай паштовак у савецкі час было неад’емным атрыбутам святочнай культуры. Святочныя паштоўкі захаваліся ў фондах усіх вышэй-

згаданых дзеячаў культуры. Аўтарамі большасці з даследаваных паштовак з'яўляліся беларускія мастакі – С. Бутко, П. Арлоў, А. Кулажэнка, М. Гаўрыловіч, В. Кісялёва [16; 17].




Мал. 9. Паштоўка «Мінск – горад-герой». Мастак М. Гаўрыловіч. Выдавецтва «Беларусь». 1975 г.

У стварэнні малюнкаў віншавальных паштовак выкарыстоўваліся прыёмы сучаснай фатаграфіі, выразная плакатная ці дзіцячая стылістыка, тыпізацыя вобразаў, візуальная стылізацыя, што забяспечвала лёгкасць чытання яе знакаў і сімвалаў і выклікала станоўчыя перцэпцыйныя ацэнкі. Яскравым сведчаннем такога ўдалага спалучэння інфармацыйна-прапагандысцкага плакатнага стылю і кампазіцыйнага размяшчэння можна вызначыць паштоўку мастака М. Гаўрыловіча «Мінск – горад-герой», на якой аўтар прадставіў шмат інфармацыі. На чырвоным фоне размешчаны зорка горада-героя і адпаведны надпіс, галоўныя мінскія помнікі пра падзеі вайны – манумент Перамогі і вечны агонь на плошчы Перамогі, танк Т-34 каля Дома афіцэраў; Дом Урада і дзяржаўны сцяг БССР, візітная картка горада – вежы будынкаў «брама горада» на прывакзальнай плошчы, сучасныя шматпавярховыя дамы – прымета шчаслівага мірнага жыцця (мал. 9) [16, арк. 14–15].

На працягу 2-й паловы XX ст. значны аб'ём эпісталярнай камунікацыі зрушыўся ў бок паштовай карткі, вызначальнымі фактарамі якой з'яўляліся паскарэнне тэмпу жыцця і здольнасць паштоўкі спалучаць якасці носьбіта значнай для афіцыйных структур візуальнай інфармацыі (паштоўка-віншаванне з афіцыйным дзяржаўным святам) і факт асабістага паведамлення. М. У. Самбур адзначае, што паштоўку можна разглядаць як змястоўную крыніцу звестак аб бытавой культуры, формах зносін, аб сацыяльнай гісторыі розных сфер працы і вольнага часу. Паштоўкі як частка перапіскі – гэта асабістыя звароты аўтараў да вызначанага адрасата, пры гэтым не прызначаныя для выдання ці азнаямлення з дасланай інфармацыяй іншых асоб, – у іх людзі выказваюць свае думкі, эмоцыі, перажыванні, апісваюць паўсядзённыя справы [19]. Адсутнасць канверта прыводзіла да тактоўнай стрыманасці і

ўжывання простых слоў і выразаў нават пры віншаванні. Менавіта такія паштоўкі дасылалі Адаму Мальдзісу пісьменнік Янка Брыль і фальклараст Уладзімір Зянько [3, арк. 6–20; 4, арк. 11–26].

Аналіз паштовак паказаў, што семантычна, стылістычна і вобразна пісьмовы тэкст толькі збольшага ўзгадняецца з сюжэтна-сэнсавымі характарыстыкамі малюнка. Перапіска А. Мальдзіса сведчыць, што ён сам і яго адрасанты цалкам прытрымліваліся традыцыі віншавання з дзяржаўнымі святамі, але ў большасці выпадкаў выкарыстоўвалі для віншавання са святам паштоўкі з падзейна-нейтральным сюжэтам [3, арк. 12; 4, арк. 34–38; 7, арк. 2–3]. Пры адсутнасці на паштоўках гатовых тэкстаў прыдумваліся віншаванні з рознымі пажаданнямі: шчасця і здароўя, кахання і дабрабыту, поспехаў на працы і міру, творчай працы на карысць Радзімы і ў асабістым жыцці і інш. [4, арк. 2].

Па віншавальных паштоўках з асабістага фонду Адама Іосіфавіча Мальдзіса можна прасачыць увесь спектр іх мастацкага афармлення ў савецкі час: на паштоўках 1950-х гг. святочныя дэманстрацыі і шчаслівыя ў мірным жыцці людзі; на паштоўках 1980–1990-х гг. плакатна-сімвальны стыль з выдатнымі эцюднымі замалёўкамі, краявіднымі фотаздымкамі і фотакалажамі на тэму свят і г. д.




Мал. 10. Паштоўка «Са святам», адрасаваная А. Мальдзісу ад У. Зянько. Мастак Л. Дубавіцкая. 1969 г.

Кожны святочны сімвал, адлюстраваны на віншавальнай паштоўцы, мае лёгкачытальны канкрэтны сэнс. На адной з навагодніх паштовак з вонкавага боку размешчана фота ўпрыгожанай навагодняй ёлкі і талерка апельсінаў. Сярод ёлачных цацак звяртае на сябе ўвагу выява ракеты. Пры гэтым віншаванне-пажаданне А. Мальдзісу ад маладзечанскага краязнаўца У. Зянько змяшчае наступныя радкі: «Калі на небе загарыцца зорка і Новы Год пастукае да вас, успомні, дружа, родныя прасторы зямлі сваёй, што гадавала нас!» [5, арк. 6]. На іншай паштоўцы лялька-дзяўчынка пад ёлкай тэлефануе, каб павіншаваць сваіх сяброў. Такі калаж быў вельмі сімвалічным, – не ўсе грамадзяне ў 1980 г. мелі хатнія тэлефоны. Паштоўка нагадвае пра жаданне беларусаў мець даступную тэлефонную сувязь [3, арк. 18]. Адна з беларускіх навагодніх паштовак у якасці сюжэта мае фота плошчы Перамогі зімовым вечарам, акружа-

нае блакітным раслінным арнаментам. Вобразам выказана надзея на шчаслівы мірны год [6, арк. 9].

Неабходна адзначыць, што Адам Іосіфавіч Мальдзіс абменьваўся віншаваннямі як з калегамі, так і са школьнікамі, якія з ілюстраваных паштовак атрымлівалі выяўленчую і пісьмовую інфармацыю пра падзеі ў жыцці грамадства. Сярод паштовак да Кастрычніцкіх свят адзначым віншавальную паштоўку 1953 г. з выявай шчаслівай дзяўчынкі (на той час гэта была пачынаючая паэтка) Валі Дарошка з Друйска, які ў той час знаходзіўся ў складзе Полацкай вобласці [4, арк. 2]. Найбольш папулярнымі, выкананымі ў стылі плакатнай прапагандысцкай графікі, з'яўляюцца паштоўкі да свята 1 мая. Выявы зямнога шара, вясновых кветак, шчаслівых дзяцей, галубоў у спалучэнні са словамі «мір» і «май» на розных мовах на паштоўках нясуць пазітыўны зарад (мал. 10) [17]. У віншавальнай карэспандэнцыі захаваліся святочныя карткі ад літаратараў. Так, Янка Брыль да традыцыйных навагодніх пажаданняў добрага здароўя, светлага настрою, выдатных поспехаў дадаваў «плёну ў працы» [3, арк. 6–20].

Рэспандэнты А. Мальдзіса віншавалі яго па-беларуску. Нават брытанскі славіст Арнольд МакМілін (папулярызатар беларускай літаратуры) старанна выводзіў у паштоўцы беларускія словы (мал. 11). Адам Мальдзіс атрымліваў паштоўкі ад паэта і фалькларыста Уладзіміра Зянько з Маладзечна ў 1960–1970-х гг. (мал. 12). У зборы А. І. Мальдзіса захаваліся карткі на беларускай мове. Гэта паштоўкі аўтарства мастакоў В. Кісялёвай, К. Бярэйша і фатографа А. Лабады.




Мал. 11. Адваротны бок паштоўкі да А. І. Мальдзіса ад прафесара-славіста з Ліверпульскага ўніверсітэта Арнольда МакМіліна




Мал. 12. Паштоўка «Са святам», адрасаваная А. Мальдзісу ад У. Зянько. Мастак І. Дзергілёў. Міністэрства сувязі СССР. 1978 г.

У савецкі час паштоўкі да рэлігійных свят не выпускаліся афіцыйнымі выдавецтвамі. У такіх абставінах творчыя асобы стваралі віншавальныя карткі самі. Сярод лістоў, дасланых Максіму Танку, захоўваецца і паштоўка-малюнак У. Караткевіча. Сюжэт малюнка нагадвае пра ка-

лядны абрад, а побач тэкст віншавання з каталіцкімі Калядамі ў прыпевачным стылі: «Ідэі, тэмы. Вершы, паэмы. Шчодры вечар! Багаты вечар! Хай шчасціць з імі пану Максіму! Шчодры вечар! Багаты вечар!» [1, арк. 20].



Мал. 13. Тры вершы Хаджу Кермані на персідскай мове.
Рукапіс Багдада. 1396 г.

Сярод адрасантаў А. Мальдзіса было і шмат замежных. Для спецыялістаў уяўляецца карыснай перапіска з прафесарам А. МакМіліным. Беларускага і брытанскага літаратуразнаўцаў аб'ядноўвала вывучэнне беларускай літаратуры. А. МакМілін высока адзначаў карыснасць даследавання А. Мальдзісам мемуарнай літаратуры XVIII ст. Як вынікае з перапіскі праз паштоўкі, А. Мальдзіс і А. МакМілін абменьваліся сваімі кнігамі. У працэсе камунікацыі з А. Мальдзісам прафесар пачаў вывучаць беларускую мову. Паштоўкі ад брытанскага славіста могуць выклікаць і цікавасць з боку музейных спецыялістаў, на іх размешчаны выявы прадметаў з калекцыі Брытанскага музея, Брытанскай бібліятэкі, карты, літаратурныя і архітэктурныя помнікі Вялікабрытаніі і Ірака (мал. 13) [8, арк. 2–21].



Мал. 14. Мядзведзіца Федчанкі.
Мастак Л. Арыстаў. Выдавецтва «Выяўленчае мастацтва». 1975 г.

Неабходна адзначыць вялікі пласт віншавальнай паштовачнай спадчыны Адама Іосіфавіча Мальдзіса ад савецкіх спецыялістаў. Для віншаванняў выкарыстоўваліся разнастайныя паштоўкі. Так, А. Мальдзіс даслаў П. Масальскаму віншаванне з Днём нараджэння на паштоўцы з партрэтам Янкі Маўра, а В. Грыцкевіч свае віншаванні напісаў на фотапаштоўцы пра матылька «мядзведзіца Федчанкі» (мал. 14) [7, арк. 29; 10, арк. 27].

Клопаты штодзённага жыцця і сацыяльна-эканамічныя абставіны не дазвалялі часта наведваць калег, сяброў, а людзям патрэбна была камунікацыя. Таму на маленькіх віншавальных картках разам з пажаданнямі размяшчаліся міні-лісты аб паўсядзённым жыцці аўтараў: дабрабыце і наваселлі, сямейных справах, стане здароўя, надвор'і. Даследчыкі-калегі заўсёды цікавіліся вынікамі канферэнцый, навуковымі адкрыццямі і кніжнымі выданнямі. Лепей за ўсё аб гэтым сведчаць паштоўкі ад Валянціна Грыцкевіча. Пецярбургскі музеязнаўца беларускага паходжання дзяліўся ўражаннямі пра канферэнцыі па крыніцазнаўстве, падкрэсліваў ролю выхадцаў з Беларусі ў развіцці расійскіх рэгіёнаў, абмяркоўваў падрыхтоўку да выдання даследаванняў па беларускай літаратуры і гісторыі. Віншаванне са Святам Кастрычніка і аповед пра канферэнцыю па крыніцазнаўстве, што праходзіла ў Геленджыку, В. Грыцкевіч даслаў на фотапаштоўцы з выявай аддзела рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі [7, арк. 15]. Адсылаючы лісты да А. Мальдзіса, В. Грыцкевіч часта выкарыстоўваў для сваіх паведамленняў паштовыя карткі з выявамі знакавых архітэктурных аб'ектаў г. Ленінграда (мал. 15).




Мал. 15. Паштоўка «Петродворец. Большой дворец и Большой каскад». Фатограф У. Стукалаў. Выдавецтва «Аўрора», Ленінград. 1977 г.

Вывучэнне перапіскі ў фондах дзеячаў культуры дазваляе сцвярджаць, што паштоўка ў рэальных працэсах камунікацыі на працягу 2-й паловы XX ст. трансфармавалася ў кампактны і эфектыўны сродак міжасобасных зносін, што прыводзіла да своеасаблівага спалучэння візуальнага вобраза і тэкставай часткі. У дадатак адзначым, што надзвычайная тэматычная і краявідная разнастайнасць дазваляюць разглядаць паштоўкі як рэпрэзентатыўны феномен, які характарызуе змястоўныя

аспекты культуры і нават даследчую дзейнасць у камунікатыўнай дынаміцы.

*1.* Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 25 (Максім Танк). Воп. 2. Спр. 56.
*2.* БДАМЛМ. – Ф. 56 (У. С. Караткевіч). Воп. 2. Спр. 35.
*3.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 14.
*4.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 24.
*5.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 28.
*6.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 56.
*7.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 71.
*8.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 188.
*9.* БДАМЛМ. – Ф. 327 (Адам Мальдзіс). Воп. 1. Спр. 240.
*10.* БДАМЛМ. – Ф. 392 (П. Масальскі). Воп. 1. Спр. 11.
*11.* БДАМЛМ. – Ф. 500 (В. У. Скалабан). Спр. 665.
*12.* БДАМЛМ. – Ф. 518 (Я. С. Кулік). Воп. 1.
*13.* БДАМЛМ. – Ф. 518 (Я. С. Кулік). Воп. 1. Спр. 1338.
*14.* БДАМЛМ. – Ф. 518 (Я. С. Кулік). Воп. 1. Спр. 1340.
*15.* БДАМЛМ. – Ф. 518 (Я. С. Кулік). Воп. 1. Спр. 1343.
*16.* БДАМЛМ. – Ф. 518 (Я. С. Кулік). Воп. 1. Спр. 1362.
*17.* БДАМЛМ. – Ф. 518 (Я. С. Кулік). Воп. 1. Спр. 1363.
*18. Ларина, А. Н.* Документальная открытка конца XIX – начала XX в. как источник по истории и культуре Москвы : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.09 / Ларина Анна Николаевна ; Рос. гос. гуманит. ун-т. – М., 2004. – URL: http://www.dissercat.com/content/dokumentalnaya-otkrytka-kontsa-xix-nachala-xx-vv-kak-istochnik-po-istorii-i-kulture-moskvy (дата обращения: 06.09.2024).
*19. Самбур, М. В.* Почтовая открытка как источник информации по истории и культуре / М. В. Самбур // Вестник МГУКИ. – 2013. – № 4 (54). – С. 65–69.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 03.02.2024.